УДК 94 (476) + 94 (438)

*А.М. Вабішчэвіч*

# ДАСЛЕДАВАННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939 гг.)

Артыкул прысвечаны адной з нераспрацаваных праблем гістарычнай навукі. На падставе шырокага кола крыніц прааналізавана дзейнасць беларускіх і польскіх арганізацый, устаноў, прыватных асоб у справе вывучэння гісторыі і культуры заходнебеларускіх зямель. Некаторыя крыніцы ўпершыню ўведзены ў навуковы ужытак. Робіцца выснова, што інтэлігенцыя разглядала гістарычныя даследаванні ў якасці сродку захавання беларускага насельніцтва ва ўмовах палітыкі паланізацыі ў II Польскай Рэспубліцы. Гісторыя і культура Беларусі падаваліся пераважна праз прызму нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычных поглядаў інтэлігенцыі. Аўтар звярнуў увагу на краязнаўчы рух, працы некаторых польскіх вучоных, якія па зместу, вывадах часта разыходзіліся з ідэалагічнымі ўстаноўкамі кіруючых колаў польскай дзяржавы. Узгадваюцца таксама даследаванні прадстаўнікоў этнічных меншасцей.

Нацыянальна-культурнае жыццё насельніцтва Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы адбывалася ў даволі складаных умовах. Паланізатарская тэндэнцыя, якая там дамінавала ў 1920-я – 30-я гг., стварала пагрозу для існавання беларускага этнасу. Аднак заходнебеларуская інтэлігенцыя, нягледзячы на неспрыяльныя абставіны, імкнулася супрацьстаяць паланізацыі краю. Дзякуючы самаахвярнай працы настаўнікаў, вучоных, грамадскіх і палітычных дзеячаў, былі створаны своеасаблівыя цэнтры беларускай навукі і культуры, асабліва ў Вільні. Хоць умоў для фундаментальных даследаванняў не было, але распрацоўка шматлікіх навуковых і асветніцкіх праблем у галіне беларусазнаўства актыўна ажыццяўлялася. Сярод даследчыцкіх устаноў найперш трэба адзначыць Беларускае навуковае таварыства (1918 – 1939 гг.), мэтай якога (паводле статута) з'яўлялася «рознабаковая навуковая праца, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў». Навуковая, асветніцка-папулярызатарская дзейнасць разгортвалася ў асобных секцыях – літаратурна-мастацкай, мовазнаўчай, гістарычнай і музейнай, якая апекавалася адкрытым пры таварыстве ў 1921 г. Віленскім беларускім гісторыка-этнаграфічным музеем імя І. Луцкевіча і бібліятэкай. На пасяджэннях члены БНТ выступалі з дакладамі і паведамленнямі па гісторыі, этнаграфіі, літаратуры, мове, фальклоры Беларусі. Былі праведзены ўрачыстыя мерапрыемствы да 400-годдзя беларускага кнігадрукавання (1925 г.) (на «акадэміі» выступалі з дакладамі А. Станкевіч, Б. Тарашкевіч), 400-годдзя Статута ВКЛ 1529 г. (1929 г.) (выступалі А. Зянюк, А. Луцкевіч, Я. Станкевіч), 500-годдзя смерці Вітаўта (1930 г.) (выступоўцы – М. Ільяшэвіч, Я. Станкевіч) і інш.

Летам 1926 г. па заданню БНТ мастак Я. Драздовіч вандраваў у Пінскім, Столінскім, Лунінецкім паветах Палескага ваяводства. Ён замалёўваў культавыя і грамадзянскія помнікі драўлянага дойлідства, народныя строі, этнаграфічныя тыпы, прылады сялянскага побыту, прадметы хатняга ўжытку. Шматлікія замалёўкі былі перададзены беларускаму музею ў Вільні, а таксама накіраваныя ў Інстытут беларускай культуры ў Мінску [1].

Беларускі музей удзельнічаў у шэрагу выстаў – Славянскай выстаўцы ў Рызе (1931 г.), народнага мастацтва ў Варшаве, «Палессе» ў Львове (1938 г.), а таксама арганізоўваў уласныя выстаўкі. Члены БНТ прымалі ўдзел у міжнародным з'ездзе гісторыкаў у Варшаве, рэгіянальным – у Львове. На VI Агульнапольскім з'ездзе гісторыкаў у 1935 г. у Вільні выступалі В. Грышкевіч і А. Луцкевіч. В. Грышкевіч у сваім дакладзе «Роля беларускіх зямель у польска-літоўскіх уніях» зрабіў спробу прасачыць станаўленне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы. На згаданым з'ездзе А. Луцкевіч

прадставіў свой рэферат «Нарадавольцы-беларусы і іх орган «Гоман». Значэнне выхаду ў свет «Гомана» ім было вызначана так: гэта «доказ абуджэння актыўнасці беларускай інтэлігенцыі на сваім родным, нацыянальным грунце» [2].

Нягледзячы на адсутнасць падтрымкі з боку польскай дзяржавы, у 1933 г. усё-такі быў выдадзены навуковы зборнік «Гадавік беларускага навуковага таварыства ў Вільні». Трэба адзначыць змешчаныя там артыкулы Я. Станкевіча «Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом», А. Луцкевіча «Беларускі музей імя І. Луцкевіча» (выдадзеныя ў 1933 г. асобнымі брашурамі), Б. Брэжга «Замкі Віцебшчыны» і інш. Пытанні палітычнай гісторыі ВКЛ закрануты М. Шкялёнкам у артыкуле «У трохсотыя ўгодкі смерці Вялікага канцлера Льва Сапегі».

Праблема падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. і інтэграцыі беларускіх зямель у Расійскую імперыю была ўзнята ў змешчанай у «Гадавіку» працы М. Ільяшэвіча «Расійская палітыка на землях былога беларуска-літоўскага гаспадарства за панаванне Кацярыны II і Паўла I (1772 – 1801)» (надрукаваная ў 1933 г. асобнай брашурай). Найперш там звернута ўвага на меры па уніфікацыі ў галіне адміністрацыйнага кіравання, правоў і абавязкаў гараджан, шляхты, яўрэйскага насельніцтва. Аўтар доказна сцвярджаў, што ў рэлігійным пытанні Кацярына II імкнулася да падпарадкавання сабе каталіцкага касцёла і пашырэння ўплыву праваслаўнай царквы, рашуча праследавала уніяцтва [3]. Як сведчаць сучасныя даследаванні гісторыкаў, пасля далучэння беларускага краю да Расіі царызм не клапаціўся аб пашырэнні сялянскіх правоў, абцяжарыў становішча сялян [4]. Менавіта ў такой пастаноўцы праблемы закранута сялянскае пытанне і ў ранейшых даследаваннях, сярод якіх – і дадзеная работа М. Ільяшэвіча. У ёй адзначана, што царскі ўрад прытрымліваўся прадваранскай пазіцыі, але вышэйшыя слаі мясцовага насельніцтва мелі невыразныя і неакрэсленыя змены ў настроях, ускладвалі спадзяванні на рэвалюцыйную Францыю. Гэта было сведчаннем непрыняцця палітыкі царызму па далучэнню беларускіх зямель да Расійскай імперыі, супрацьдзеяння ёй.

У 1931 – 1939 гг. пры Віленскім універсітэце дзейнічаў навуковы гурток студэнтаў-беларусаў "Таварыства прыяцеляў беларусаведы". «Згуртаваць людзей, якія хочуць паглыбіць свае веды ў галіне беларусазнаўства, а таксама весці ў гэтым напрамку сістэматычную навуковую працу», – так была вызначана асноўная мэта дзейнасці гэтага таварыства [5]. Навуковыя даследаванні ажыццяўляліся ў асобных секцыях, сярод якіх была гісторыка-эканамічная. Таварыства наладжвала этнаграфічныя экспедыцыі, збор фальклору ў заходнебеларускім рэгіёне. На сходах секцый гурткоўцы выступалі з рэфератамі. Асабліва трэба адзначыць святкаванне значных гістарычных юбілеяў – 300-годдзя смерці Л. Сапегі (1933 г.) і інш. Шырокай даследчыцкай працы перашкаджалі матэрыяльныя цяжкасці. З-за матэрыяльных праблем БНТ не змагло арганізаваць рэгулярнае выданне «Гадавіка». Навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі гістарычнай тэматыкі змяшчаліся на старонках заходнебеларускіх часопісаў «Шлях моладзі», «Студэнцкая думка», «Калоссе» і інш.

Толькі ў 1938 г. быў надрукаваны зборнік «Запісы Беларускага навуковага таварыства». У гэтым выданні мінулае і сучаснасць былі прадстаўлены «ў новым беларускім аспекце, раскрываючы праўду аб беларусах і Беларусі, часта скажоную чужацкімі даследчыкамі» [6]. Сярод апублікаваных у «Запісах БНТ» матэрыялаў трэба адзначыць артыкулы Х. Ільяшэвіча «Канец існавання друкарні дому Мамонічаў», Б. Брэжга «Скарга Рыжскай рады канца XIII ст.», Я. Станкевіча «Мова дыпламатычнага ліста Рыжскай рады 1271 – 1280» і інш. Навуковай навізной вылучаўся артыкул М. Шкялёнка «Падзел гісторыі Беларусі на перыяды». Выкладзеная ім перыядызацыя не адмаўляла агульнадзяржаўны падыход, але разглядала пытанні дзяржаўнай прыналежнасці ў сукупнасці з комплексам іншых. На яго думку, за аснову

перыядызацыі было мэтазгодна ўзяць глыбокія, пераломныя змены ў палітычным, сацыяльным і культурным жыцці беларускага народа. Зыходзіў ён з таго, што асобныя моманты ў развіцці разнастайных галін жыцця народа былі цесна звязаны з эвалюцыяй яго дзяржаўнасці. Замест падзелу гісторыі Беларусі на полацкі, літоўска-беларускі, польскі, расійскі, савецкі перыяды М. Шкялёнак прапанаваў наступную перыядызацыю: 1) перыяд асобных дзяржаў (IX – сярэдзіна XIII ст.); 2) перыяд суцэльнай дзяржаўнасці (сярэдзіна XIII – канец XVII ст.); 3) перыяд упадку беларускай дзяржаўнасці (з канца XVII ст.). Пры характарыстыцы 2-га перыяду абвяргалася сцвярджэнне-тэзіс аб літоўскім заваяванні беларускіх зямель. Знешняя небяспека, хрысціянства, знешнегандлёвыя адносіны паспрыялі ўтварэнню суцэльнай дзяржавы – ВКЛ. Аўтар лічыў, што новая дзяржава з'яўлялася беларускай. Такім чынам, ён не прызнаваў, што грамадства ВКЛ было поліэтнічным, поліканфесійным. Канцом 2-га перыяду прызнаны 1697 г., калі беларуская мова страціла ў Рэчы Паспалітай дзяржаўны статус. Прапанаваная М. Шкялёнкам перыядызацыя не з'яўляецца бясспрэчнай і поўнасцю абгрунтаванай, хоць заслугоўвае ўвагі навукоўцаў. У тым жа зборніку «Запісы БНТ» гэты аўтар у артыкуле «Прадмет беларускай гісторыі» прааналізаваў асноўныя метадалагічныя падыходы ў гістарычнай навуцы.

Цікавасць уяўляюць і асобныя працы старшыні БНТ А. Луцкевіча. У 1920 г. была выдадзена ў Вільні яго брашура «Польская акупацыя ў Беларусі». Ён даследаваў не толькі нарадавольніцкі рух, пра што згадвалася вышэй, але і гісторыю Беларускай рэвалюцыйнай грамады (Беларускай сацыялістычнай грамады): у 1928 г. выйшла яго праца «За дваццаць пяць гадоў (1903 – 1928)». Адсутнасць архіўных даных, мемуарны характар работы не змяншаюць яе навуковай вартасці. А. Луцкевіч вывучаў Статут ВКЛ 1529 г., мову скарынаўскіх выданняў. У заходнебеларускім друку з'яўляліся яго публікацыі па гісторыі беларускай культуры, мастацтва. Для забеспячэння вучняў беларускіх гімназій падручнікамі на роднай мове БНТ займалася іх перакладамі і выданнем. А. Луцкевіч пераклаў на беларускую мову падручнік В. Остэрлёфа і Я. Шустэра «Сусветная гісторыя» (частка 2 – «Сярэднявечная гісторыя») (Вільня, 1921).

Поўнасцю творчая спадчына А. Луцкевіча да сённяшняга часу пакуль не апублікавана. Яшчэ чакаюць сур'ёзнага даследавання асобныя архіўныя матэрыялы. Сярод іх – рукапіс па айчыннай гісторыі, дзе адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці Беларусі з глыбокай старажытнасці [7]. Аналізуючы гісторыю Полацкага княства, А. Луцкевіч падкрэсліваў, што яго палітычная магутнасць пачала трациццa пасля Усяслава Чарадзея. Арыгінальнасцю і адметнасцю вылучаюцца высновы А. Луцкевіча адносна прыняцця хрысціянства. Хоць у рукапісе адсутнічае дэталёвы разбор пытання, але важнасць набывае сама яго пастаноўка. Хрысціянства прыйшло, на яго думку, з польскіх зямель ці з Візантыі («праз беларускае варажскае купецтва») і значна раней, чым у канцы X ст. Звернута ўвага на грамадска-палітычны лад Полацкага і іншых княстваў на тэрыторыі старажытнай Беларусі. Развітасць вечавых традыцый паспрыяла станаўленню дзяржаўнасці. Немалую ролю ў гэтым сыгралі гарады. «Беларусь здаўна адзначалася вялікаю лічбай гарадоў і мястэчак, асабліва ў часы Варажскага гандлю (маецца на ўвазе існаванне воднага шляху «з вараг у грэкі», г. зн. з Балтыйскага ў Чорнае мора, які праходзіў праз тэрыторыю старажытнай Беларусі – А. В.)» [8]. Наогул, аўтар выступаў супраць тэзіса, што беларусы не мелі сваёй дзяржаўнасці ў мінулым.

Не меншую цікавасць выклікаюць і шматлікія работы А. Станкевіча. Ён даў высокую ацэнку гуманістычнай накіраванасці, дэмакратычнаму характару дзейнасці Ф. Скарыны («Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі (1525 – 1925)» (Вільня, 1925). Гісторыя вызваленчай барацьбы беларускага народа выкладзена ім у работах «Вітаўт Вялікі і беларусы» (Вільня, 1930), «Кастусь Каліноўскі, «Мужыцкая праўда» і ідэя незалежнасці Беларусі» (Вільня, 1933), «Да гісторыі беларускага

палітычнага вызвалення» (Вільня, 1935). Яго кнігі «Беларускі хрысціянскі рух» (Вільня, 1939), «Хрысціянства і беларускі народ» (Вільня, 1940) з'яўляюцца грунтоўнымі даследаваннямі па гісторыі хрысціянства і хрысціянска-дэмакратычнага руху на Беларусі. У рабоце «Хрысціянства і беларускі народ» ёсць шмат глыбокіх і змястоўных высноў. У прыватнасці, А. Станкевіч лічыў, што уніяцтва не магло не пашырацца на Беларусі, якая не толькі знаходзілася, але і вагалася паміж Усходам і Захадам. Адна з яго брашур – «Беларуская мова ў школах Беларусі XVI – XVII ст.» (Вільня, 1928) – асвятляла пытанні з гісторыі адукацыі.

Беларускі музей у Вільні праводзіў шырокую асветніцкую працу. Як сведчыць інвентарная кніга музея, у 1937 г. там налічвалася 4228 экспанатаў, звязаных з этнаграфіяй, мастацкімі промысламі, скульптурай, земляробчымі прыладамі і інш. Колькасць наведвальнікаў узрастала: толькі за 4 месяцы 1938 г. зафіксавана больш за 4 тыс. чалавек. Беларускі музей супрацоўнічаў з музеем Віленскага таварыства аматараў навукі, які рэпрэзентаваў польскую культуру, а таксама з музеем Літоўскага навуковага таварыства, яўрэйскім і татарскім музеямі. Аднак адсутнасць фінансавых сродкаў ускладняла існаванне беларускага музея ў Вільні. Дзейнасць музея супярэчыла агульным установкам паланізатарскай палітыкі ўладаў. Напярэдадні 1939 г. існавалі праекты яго аб'яднання з іншымі музейнымі ўстановамі.

Беларускія нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычныя дзеячы фактычна далучыліся да распрацоўкі і папулярызацыі той канцэпцыі гісторыі Беларусі, якая была выкладзена таксама ў працах У. Ігнатоўскага, В. Ластоўскага, М. Доўнар-Запольскага, А. Цвікевіча і іншых даследчыкаў канца XIX – першай трэці XX стст. Ва ўмовах заходнебеларускай рэчаіснасці такая дзейнасць разглядалася як своеасаблівы выклік польскай уладзе, якая ігнаравала самастойнае існаванне беларускага этнасу. Акрамя таго, ацэнкі гістарычных падзей у заходнебеларускіх выданнях разыходзіліся з тымі падыходамі, што замацаваліся ў савецкай беларускай гістарычнай навуцы ў 1930-я гг.

Варта падкрэсліць, што працы заходнебеларускіх дзеячаў па гісторыі, краязнаўстве не былі акадэмічнымі навуковымі даследаваннямі. Яны мелі пераважна навукова-папулярны характар. Ва ўмовах узмацнення паланізацыі немалое значэнне набывала менавіта праблема захавання, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны народа. Ажыццяўлялася гэта не толькі навуковымі і грамадскімі ўстановамі, беларускімі пачатковымі школамі і гімназіямі, перыядычным друкам, але і культурна-асветніцкімі арганізацыямі – Таварыствам беларускай школы, Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры і іншымі. Ідэйна-палітычныя разыходжанні не дазволілі ім наладзіць сумесную абарону нацыянальных інтарэсаў.

Вялікую цікавасць да гісторыі і культуры краю праяўлялі таксама польскія навуковыя ўстановы і асобныя даследчыкі. Самы непасрэдны ўдзел у вывучэнні прымалі прафесары Ц. Эрэнкройц, К. Машынскі з Віленскага універсітэт імя С. Баторыя, намаганнямі якіх быў створаны там этнаграфічны музей. У 1932 г. у фондах музея налічвалася 2106 экспанатаў – твораў народнага мастацтва з усёй Заходняй Беларусі, уласны архіў. Музей падтрымліваў сувязі з арганізацыямі Таварыства дапамогі народным промыслам у Вільні, Брэсце, Навагрудку.

У 1929 г. на аснове прыватных калекцый археалогіі, нумізматыкі і старадрукаў І. Стаброўскага пачаў дзейнічаць краязнаўчы музей у Слоніме. Палескае таварыства краязнаўства ў 1924 – 1926 гг. наладзіла збор матэрыялаў для адкрыцця музея ў Пінску. Музей быў адкрыты ў гэтым палескім горадзе ў 1926 г. Да 1939 г. там было 7200, а ў сярэдзіне 1941 г. – больш за 11 тыс. адзінак аб прыродзе, побыце, гісторыі і культуры Заходняга Палесся. Шмат клопату аб развіцці краязнаўчай працы праяўляў гісторык Р. Гарашкевіч. Ён рэдагаваў польскамоўны краязнаўчы альманах «Пінская зямля». Яму належыць аўтарства кніг і брашур «Пінск і яго ваколіцы» (1926 г.), «Традыцыі Пінскай

зямлі» (1928 г.), «Гістарычныя нататкі аб некаторых мясцовасцях Пінскага павета (1928 г.), «Столінскі павет (гістарычныя нататкі)» (1930 г.). Дзве работы Р. Гарашкевіча – «Засцянковая шляхта на ўсходніх землях» (1936 г.) і «Спіс родаў засцянковай шляхты Пінскай зямлі» (1937 г.) – прысвечаны генеалогіі, геральдыцы шляхецкіх родаў. Паводле даследчыка, у Пінскім, Столінскім, Лунінецкім паветах у сярэдзіне 1930-х гг. жыло каля 30 тыс. прадстаўнікоў засцянковай шляхты. Паводле паходжання яны дзяліліся на 3 групы: 1) са старых мясцовых родаў; 2) з прыезджых; 3) шляхта татарскага паходжання. «Асноўная рыса засцянковай шляхты – усведамленне шляхецкага паходжання і агульнасці – вельмі моцная менавіта на Палессі. Затое не гаворыць ужо гэтая шляхта па-польску. Яе веравызнанне – пераважна праваслаўе (90%), – адзначаў Р. Гарашкевіч. – …Палеская шляхта вызначаецца найперш вялікай традыцыйнасцю» [9]. Аўтар коратка прасачыў гісторыю асобных родаў, відазмяненне іх прозвішчаў, лёс некаторых населеных пунктаў.

У Гродне ў 1922 г. быў адкрыты мясцовай камісіяй па ахове помнікаў мастацтва і культуры гістарычны музей, дзе захоўвалася больш за 16 тыс. адзінак – археалагічных знаходак, абразоў, старадрукаў, нумізматычных рэліквій, слуцкіх паясоў і інш. (большасць з іх у час Другой сусветнай вайны знікла). У 1930-я гг. у гэтым горадзе адчыніў дзверы дом-музей польскай пісьменніцы Э. Ажэшкі. Па ініцыятыве настаўніка Л. Турскага ў 1929 г. з'явіўся краязнаўчы музей і ў Баранавічах. У 1935 г. Г. Пехам быў заснаваны музей у Ваўкавыску. Цікавым быў і музей А. Міцкевіча ў Навагрудку, адкрыты напярэдадні 1939 г. Сярод экспанатаў і рэдкія літаграфіі, рукапісы паэта, яго пасмяротная маска, мадэлі помнікаў і інш. У музеі была багатая бібліятэка. Усё гэта загінула ў час вайны. Музей стварылі нанова да 100-годдзя смерці А. Міцкевіча ў 1955 г.

Яшчэ ў 1920-я гг. знакаміты жывапісец Ф. Рушчыц, які жыў у 1919 – 1932 гг. у Вільні, захапіўся ідэяй стварэння беларускага скансена – музея матэрыяльнай культуры пад адкрытым небам. Ён агледзеў руіны замкаў у Міры, Лідзе, Крэве і іншых месцах, зрабіў іх замалёўкі. Выяўленнем і фіксацыяй помнікаў даўніны займаліся таксама вучоныя, архітэктары, фатографы, краязнаўцы, што ўваходзілі ў Віленскае таварыства аматараў навукі. У 1923 – 1939 гг. таварыства выдавала па-польску гістарычны часопіс «Атэнэум віленскі». Часткова дапамогу аказвала Камісія па ахове помнікаў старажытнасці (у пачатку 1930-х гг. яе ўзначаліў Ф. Рушчыц). Студэнты Варшаўскага універсітэта пад кіраўніцтвам прафесараў Я. Клоса, З. Дмахоўскага выконвалі замалёўкі, абмеры жылых і гаспадарчых забудоў у вёсках і мястэчках. Аднак хутка польскія ўлады спынілі дзейнасць згаданай камісіі. Другая сусветная вайна канчаткова парушыла планы стварэння беларускага скансена.

Некаторыя захады па захаванню помнікаў гісторыі польскія ўлады ўсё-такі рабілі. Праводзіліся работы па кансервацыі Каложскай царквы ў Гродне, Крэўскага замка. У 1920-я гг. архітэктар Г. Гай перабудаваў корпус манастыра францысканцаў у Пінску. Рэстаўрацыйныя работы адбываліся ў Ружанскім палацы, Андрэеўскім касцёле ў Слоніме. Археалагічнымі даследаваннямі займаліся У. Антаневіч, У. Галубовіч, Г. Цэгак-Галубовіч, Я. Савіцкі, С. Крукоўскі і іншыя. Польскі археолаг Ю. Ядкоўскі даследаваў Стары замак у Гродне. Гэты даследчык напісаў шэраг прац па старажытнай гісторыі і культуры Гродзеншчыны: «Гродна» (1923 г.), «Гарадзішча Ваўкавыска» (1925 г.), «Раннесярэдневяковае Гродна ў святле археалагічных раскопак у Гродзенскім каралеўскім замку ў 1932 і 1933 гг.» (1934 г.), «Абарончы храм на Каложы ў Гродне» (1936 г.) і інш. У 1937 – 1939 гг. Р. Якімовіч праводзіў раскопкі гарадзішча ў Давыд-Гарадку. Напярэдадні там пры земляных работах (будавалася новая царква замест згарэлай) былі выяўлены дубовыя саркафагі.

У тагачаснай Польшчы, дзе налічвалася шмат няпольскага насельніцтва, даволі вострым было нацыянальнае пытанне. Нярэдка для абгрунтавання сваіх

каланізацыйных і асіміляцыйных планаў польскія ўлады выкарыстоўвалі навуковыя ўстановы. Менавіта такія спадзяванні ўскладваліся на Інстытут даследавання нацыянальных праблем, што існаваў у 1921 – 1939 гг. У Вільні была створана літоўска-беларуская камісія гэтага Інстытута, якая спрабавала разгарнуць вывучэнне літаратуры, гісторыі, эканомікі, дэмаграфіі, а таксама беларусазнаўства. Праводзіліся выставы, сходы, справаздачы, рыхтаваліся навуковыя рэфераты. 20-21 верасня 1936 г. адбыўся I навукова-справаздачны з'езд, прысвечаны «ўсходнім крэсам». Наогул, Інстытут імкнуўся падтрымліваць афіцыйны курс польскіх урадавых колаў па нацыянальнаму пытанню. Гэта адчуваецца ў змесце, высновах публікацый, змешчаных на старонках друкаванага органа Інстытута – часопіса «Нацыянальныя справы» (на польскай мове). У прыватнасці, А. Крысінскі ў шэрагу артыкулаў па дэмаграфіі не выказваў сур'ёзных пярэчанняў супраць фальсіфікацыі статыстычных звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі. Аднак дадзены навуковы часопіс заслугоўвае пільнай увагі. Там былі змешчаны работы Я. Станкевіча: палемічныя нататкі аб паходжанні беларусаў і ўкраінцаў (1931. – № 4-5, 6), артыкулы аб рэформе беларускага правапісу 1933 г. у БССР (1934. – №1; 1935. – №1-2) і інш. Польскі этнасацыёлаг Ю. Абрэмбскі ў сваіх працах абгрунтоўваў тэорыю этнічнай групы, раскрываў этнічную структуру Палесся. Вынікі сваіх даследаванняў ён толькі часткова апублікаваў у навуковым друку (у часопісах «Нацыянальныя справы», «Сацыялагічны агляд»).

Большай аб'ектыўнасцю вызначаліся навуковыя распрацоўкі, праведзеныя самімі прадстаўнікамі няпольскага насельніцтва. Так, з вялікім энтузіязмам узяліся за вывучэнне ўласнай спадчыны татары. У 1929 г. быў выдадзены "Гербоўнік татарскіх родаў у Польшчы" С. Дзядулевіча. У 1932 г. у Вільні надрукаваны першы том "Татарскага штогодніка" (на польскай мове), дзе змешчана даволі шмат артыкулаў і матэрыялаў па гісторыі і культуры татараў. З-за фінансавых цяжкасцей часопіс выходзіў нерэгулярна – наступныя тамы з'явіліся ў 1935 і 1938 гг. Асабліва трэба адзначыць трэці том – асобнае даследаванне С. Крычыньскага «Літоўскія татары: Спроба гісторыка-этнаграфічнай манаграфіі» (па-польску выдадзена ў Варшаве). У 12 раздзелах кнігі гісторык падрабязна разглядаў рода-племянную арганізацыю, рысы характару, традыцыйныя заняткі, матэрыяльную культуру, рэлігійнае жыццё, школы і кнігі, мову і пісьменнасць, абрадавыя звычаі і іншыя бакі мінулага і сучаснасці свайго народа. У якасці крыніц выступалі як друкаваныя матэрыялы, архіўныя дакументы, рукапісы, так і запісаныя выказванні татарскіх жыхароў. У спіс інфарматараў трапілі татары з Даўбуцішак, Клецка, Ляхавічаў, Сорак Татар, Міра, Навагрудка, Слоніма, Вільні і іншых населеных пунктаў.

Даволі актыўна дзейнічаў Яўрэйскі навуковы інстытут, які быў заснаваны ў 1925 г. у Вільні. Нягледзячы на полідысцыплінарны характар яго даследаванняў, найважнейшай секцыяй была менавіта гістарычная. У 1929 – 1939 гг. яна выдала на ідыш 3 тамы часопіса «Гістарычны шрыфт». Там жа, у Вільні, друкаваўся ў 1931 – 1939 гг. яшчэ адзін часопіс на ідыш, а таксама бюлетэнь на англійскай мове. Усяго ў 1925 – 1939 гг. супрацоўнікі згаданага інстытута змясцілі ў друку каля 6 тыс. публікацый [10]. Яўрэйскі навуковы інстытут ажыццяўляў шырокае міжнароднае супрацоўніцтва. Была сабрана вялікая калекцыя фатаграфій, частка якой захавалася ў ЗША.

Такім чынам, у міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзіліся разнапланавыя даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Беларускія грамадскія арганізацыі, нешматлікая інтэлігенцыя разглядалі працэс вывучэння мінулага як адзін са сродкаў захавання ўласнага народа ва ўмовах паланізацыі. Айчынную гісторыю і культуру яны асвятлялі праз прызму нацыянальна-дэмакратычных поглядаў. Польскія ўрадавыя колы і блізкія да іх навуковыя ўстановы імкнуліся спрыяць далейшай інкарпарацыі і асіміляцыі насельніцтва «ўсходніх крэсаў», таму праводзілі тэндэнцыйныя даследаванні.

Асобныя дзеячы польскай навуковай грамадскасці імкнуліся вывучаць самабытны полікультурны, поліэтнічны заходнебеларускі край, не зважаючы на ідэйна-палітычныя фактары і ўстаноўкі. Такія падыходы падтрымлівалі і прадстаўнікі этнічных меншасцей.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1 Бібліятэка АН Літвы. – Аддзел рукапісаў. – Ф. 21. – Спр. 7. – Арк. 1; Язэп Драздовіч. Альбом-манаграфія. – Мн.: Беллітфонд, 2002. – С. 15 – 16.

2 Бібліятэка АН Літвы. – Аддзел рукапісаў. – Ф. 21. – Спр. 339. – Арк. 34.

3 Ільяшэвіч М. Расейская палітыка на землях былага Беларуска-літоўскага гаспадарства за панаваньня Кацярыны II і Паўлы I (1772 – 1801). – Вільня, 1933. – С. 18.

4 Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. – Мн.: Беларуская навука, 1997. – Т. 1. – С. 267.

5 Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 24. – Арк. 133.

6 Запісы Беларускага навуковага таварыства: Сшытак першы. – Вільня, 1938. – С. 69.

7 Бібліятэка АН Літвы. – Аддзел рукапісаў. – Ф. 21. – Спр. 331. – Арк. 34.

8 Там жа. – Арк. 10.

9 Horoszkiewicz R. Szlachta zaściankowa na ziemiach wschodnich. – Wydanie II. – Pińsk, 1937. – S. 20.

10 Żebrowski R. Historiografia // Żydzi w Polsce. Dzieje i kultura. Leksikon. – Warszawa: Wydawnictwo Cyklady, 2001. – S. 180.



***Vabishchevich A.M.*** **Research of Historical-Cultural Heritage in Western Belarus (1921 - 1939)**

The article is devoted to one of the least studied in historical science. The author analyses the activity of Belarusian and Polish organizations, institutions and individuals, who studied history and culture in Western Belarusian lands. Some historical sources are intro-duced in the scientific paper for the first time. It is concluded that intelligentsia considered historical research as a means of keeping Belarusian population in the condition of poloniz-ing policy in the Second Polish Republic.The history and culture of Belarus was studied mainly from the point of national and christian-democratic views of intelligentsia. The author pays attention to regional studies movement and the works of some Polish scientist, the con-tents of which often did't concide with ideological sets of the ruling circles in the Polish State. The author mentions the research of some representatives of ethnic minorities as well.


Рукапіс паступіў у рэдкалегію 20.12.04